# І МУДРАСЦІ, І ВЕДАЎ ХРАМ

## ДА 100-ГОДДЗЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

*Розгалас*

Таццяна ЛАЎРЫК,
загадчык сектара аналітычнай інфармацыі па культуры і мастацтве інфармацыйна-аналітычнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

### 135-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЗМІТРАКА БЯДУЛІ Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ БЕЛАРУСІ

Важны кірунак дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – стварэнне віртуальных праектаў і выстаў. Першыя праекты з’явіліся ў 2012 г.: “Класікі сусветнай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас” і “1812 год у гісторыі Беларусі”.

Каб больш падрабязна распавесці пра віртуальнае жыццё бібліятэкі, звернемся да рэсурсу “На хвалі часу, у плыні жыцця” (2019–2023), прымеркаванага да 100-годдзя ўтварэння літаратурнага аб’яднання “Маладняк” (1923–1928). Гэты праект рэалізуецца супольна Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і выдавецкім домам “Звязда” (часопісам “Маладосць”, з ліпеня 2021 г. – газетай “Літаратура і мастацтва”). Ён быў задуманы, каб вярнуць памяць пра першае творчае згуртаванне пісьменнікаў Беларусі і яго заснавальнікаў, сярод якіх шмат вядомых асоб: Пятрусь Броўка, Міхась Лынькоў, Уладзімір Дубоўка, Кандрат Крапіва, Змітрок Бядуля і іншыя. Праект выходзіць на рэспубліканскі ўзровень. На сёння да яго партнёраў далучыліся шматлікія ўстановы, што ўшаноўваюць памяць пісьменнікаў-маладнякоўцаў: Шклоўская раённая бібліятэка, Пастаўская дзіцячая бібліятэка імя Уладзіміра Дубоўкі, Цімкавіцкая сельская бібліятэка, Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі, Літаратурны музей Петруся Броўкі, Літаратурны музей Кузьмы Чорнага, Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса, гісторыка-краязнаўчы музей “Бацькаўшчына” Каменскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад – сярэдняя школа і інш.

Намаганнямі ўдзельнікаў ствараецца кантэнт “На хвалі часу, у плыні жыцця”: на партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі выстаўляюцца алічбаваныя часопісы “Маладняка”, кнігі яго сяброў. Тут можна знайсці фатаграфіі, копіі дакументаў, рукапісаў, ліставанне пісьменнікаў, убачыць фота каштоўных рэчаў, якія захоўваюцца ў музеях і архівах, што ўдзельнічаюць у праекце.

На працягу 2019–2022 гг. прайшлі мерапрыемствы і былі падрыхтаваныя раздзелы, прымеркаваныя да ўгодкаў з дня нараджэння ўдзельнікаў “Маладняка”: Валерыя Маракова, Адама Бабарэкі, Уладзіміра Хадыкі, Уладзіміра Дубоўкі, Кузьмы Чорнага, Яна Скрыгана, Андрэя Александровіча, Змітрака Бядулі, Міхася Зарэцкага, Алеся Гурло, Язэпа Пушчы.

Удзельнікі праекта папулярызуюць яго праз публікацыі на старонках навуковых выданняў, выступленні на канале “Культура” Беларускага радыё ў перадачы “Дыялогі пра культуру”, правядзенне лекцый і ўдзел у навуковых канферэнцыях у самых розных установах культуры і адукацыі. Сярод іх – Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў і інш.

З 2020 г., пасля пачатку пандэміі COVID-19, давялося шукаць новыя формы мерапрыемстваў, іншыя магчымасці папулярызацыі праекта. Адной з актыўных форм стала правядзенне анлайн-мерапрыемстваў з запісам на ютуб-канале. Выкарыстанне відэапрэзентацый, віртуальных семінараў, анлайн-конкурсаў спрыяла выхаду праекта на рэспубліканскі ўзровень. Карысць падобных мерапрыемстваў у тым, што

яны даступныя ўсім ахвотным, як жыхарам Беларусі, так і замежным удзельнікам.

135-годдзе з дня нараджэння класіка Змітрака Бядулі (Самуіла Плаўніка), аднаго з сяброў літаб'яднання "Маладняк"адзначалася 23 красавіка 2021 г. Нацыянальная бібліятэка Беларусі разам з сынам пісьменніка, Яфімам Плаўнікам, разгарнула марафон святкавання цягам усяго 2021 г. і пачатку 2022 г. Актыўны ўдзел Я. Плаўніка ва ўсіх мерапрыемствах зрабіў значны ўнёсак у папулярызацыю творчасці З. Бядулі, заклікаў дзяцей і дарослых Беларусі звярнуцца не толькі да такіх праграмных твораў гэтага аўтара, як апавяданні "Бондар" і "На Каляды к сыну", але і да тых, што ўваходзілі ў ранейшыя школьныя праграмы: вершаваная казка "Сярэбраная табакерка" і аповесць "Салавей".

Сустрэча з Я. Плаўнікам упершыню адбылася ў студзені 2021 г., калі мы рыхтаваліся да правядзення навукова-практычнага семінара "Шляхамі маладнякоўцаў": да 135-годдзя з дня нараджэння З. Бядулі і 120-годдзя з дня нараджэння М. Зарэцкага. Семінар праходзіў у жывым эфіры з трансляцыяй на ютуб-канале.

Незабыўным момантам на семінары стаў відэавыступ Я. Плаўніка, зроблены ў яго дома. Ён нагадаў усім прысутным пра важную для беларусаў падзею – перапахаванне З. Бядулі ў нашай краіне 3 лістапада 2020 г. Сам жа Я. Плаўнік, які пасля цяжкай хваробы не мог наведаць семінар, атрымаў магчымасць прагледзець усе даклады выступоўцаў.

На круглым стале "Беларускі салавей" 29 красавіка 2021 г. быў прэзентаваны віртуальны раздзел з поўнымі тэкстамі 30 прыжыццёвых кніг пісьменніка. Каштоўнасць праекта ў тым, што іх можна спампоўваць не выходзячы з дому. Акрамя кніг, бібліяграфічных запісаў, крытычных матэрыялаў тут можна пазнаёміцца з вялікай колькасцю фотаматэрыялаў, адсканаваных дакументаў, перададзеных нашымі партнёрамі.

Ганаровым госцем бібліятэкі стаў Я. Плаўнік, ён падзяліўся ўспамінамі пра бацьку. Ад сына пісьменніка Нацыянальная бібліятэка Беларусі атрымала ў падарунак зборнік навел "Танзілія" (1927), якога не было ў фондах, а таксама каштоўныя фотаздымкі з сямейнага альбома.

У межах праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця" з 2020 г. распачалася арганізацыя літаратурных анлайн-конкурсаў.

Адным з першых стаў анлайн-конкурс чытальнікаў "О Беларусь, мая шыпшына" да 120-годдзя з дня нараджэння У. Дубоўкі (1 кастрычніка – 15 лістапада 2020 г.). Неабходна было напісаць эсэ з сюжэтнай лініяй (прыквел, сіквел або спіноф) па адным з прапанаваных твораў З. Бядулі: "Салавей", "Сярэбраная табакерка", "Бондар", "На Каляды к сыну". Таксама на конкурс паступалі аўдыязапісы чытання твораў удзельнікаў, якія пазней прагучалі ў эфіры праграмы "Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя" канала "Культура" Беларускага радыё. Не абышлося без мастацкіх твораў – дзіцячых малюнкаў і вялікага вышыванага партрэта, які на выніковым мерапрыемстве конкурсу ўручыла ў падарунак Нацыянальнай бібліятэцы бібліятэкарка з Пінкавіцкай сельскай бібліятэкі Святлана Мажароўская.

Для правядзення конкурсу быў створаны аргкамітэт з супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, які прымаў і рэгістраваў творчыя працы і анкеты ўдзельнікаў, размяшчаў урыўкі эсэ ў сацыяльных сетках праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця". Адзначым, што падчас першага конкурсу на "Фэйсбуку" ўзнікла суполка, якая цяпер перайменавана ў «"Маладняк" – першае літаратурнае аб'яднанне» (больш за 1100 удз.), а падчас рэалізацыі конкурсу "Беларускі салавей" быў створаны інстаграм-акаўнт – @maladnyak_konkursy_nlb. Інфармацыя з іх вельмі запатрабаваная і выклікае цікавасць сярод дарослых і дзяцей.

Творчы праект выклікаў неверагодную цікавасць у вучняў, студэнтаў, настаўнікаў, сяброў літаратурных аб'яднанняў, супрацоўнікаў бібліятэк з усёй Беларусі: было 827 удзельнікаў ва ўзросце ад 6 да 71 года. Памятнымі падарункамі і дыпломамі ўзнагароджаны 72 удзельнікі літаратурнага конкурсу: 12 пераможцаў (у чатырох узроставых катэгорыях) і 60 чалавек, адзначаных у 28 дадатковых намінацыях.

18 студзеня 2022 г. у Нацыянальнай бібліятэцы адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу. Сапраўдным падарункам для прысутных стала выступленне ганаровага госця Яфіма Плаўніка, які таксама знаёміўся з найлепшымі працамі. Ён падзякаваў усім, хто прычыніўся да праекта "Беларускі салавей". Дзякуючы актыўным намаганням удзельнікаў праекта і Яфіма Самуілавіча пачало рухацца пытанне пра стварэнне і ўзвядзенне помніка Змітраку Бядулю на месцы яго перапахавання. У плане мерапрыемстваў Міністэрства культуры да Года гістарычнай памяці (2022) у верасні значыцца стварэнне надмагільнага помніка класіку, адказнасць за выкананне ўзялі Міністэрства культуры і Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў. Па словах Яфіма Плаўніка, "толькі дзякуючы вялікай колькасць людзей, якія зацікавіліся гэтым літаратурным конкурсам, удалося дасягнуць такіх вынікаў".

"На хвалі часу, у плыні жыцця" – вялікая рэспубліканская ініцыятыва, закліканая аб'яднаць вакол сябе ўсіх зацікаўленых у захаванні літаратурнай спадчыны краіны. Мы спадзяёмся, што праект пасля яго завяршэння пакіне след у сэрцах удзельнікаў, паспрыяе захаванню гісторыі беларускай літаратуры, раскрые для чытачоў новыя імёны літаратараў нашай краіны.